*Вячаслаў Калацэй*

# «КАЛІ ПЕСНЯ АДНА НА ДВАІХ»: ФАЛЬКЛОР БЕЛАРУСІ Ў ЛЁСЕ УЛАДЗІМІРА РАГОВІЧА І НАТАЛЛІ МАЗУРЫНАЙ

*У артыкуле прааналізаваны ўплыў музыкі вуснай традыцыі і практычнай фалькларыстыкі на асабістыя ўзаемаадносіны і асобу тых, хто імі займаецца, на прыкладзе лёсаў фалькларыста, кандыдата філалагічных навук Наталлі Мазурынай ды хармайстра і этнамузыколага Уладзіміра Раговіча.*

*Viachaslau Kalatsei*

# «WHEN THE SONG IS ONE FOR TWO»: THE FOLKLORE OF BELARUS IN THE FATE OF VLADZIMIR RAGOVICH AND NATALIA MAZURINA

*In the article the author analyzes the influence of oral tradition music and practical folklore studies on the personal relationships and personality of those who are engaged in them. The analysis was made on the example of the fate of candidate of philology Natalia Mazurina and choirmaster, ethnomusicologist Vladzimir Ragovich.*

Калі народжаная і выхаваная ў мінскіх брукаваных урбаністычных асяродках Наталля Мазурына (з роду настаўнікаў і музыкаў з Лёзненскага раёна Віцебшчыны) абрала спецыяльнасць школьнага настаўніка музыкі і стала студэнткай педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, яна не меркавала, што яе жыццё ў будучым шчыльна перапляцецца з аўтэнтычнай беларускай песняй, фалькларыстыкай, даследаваннем традыцыйнай культуры. Але лёс вырашыў па-свойму. Студэнткай выпускнога курса прафесар Алег Аляхновіч пазнаёміў яе са сваім калегам – на той час ужо мэтрам айчыннай практычнай фалькларыстыкі – Уладзімірам Раговічам. Нагодай быў сумесны творчы праект: фальклорнае трыа У. Раговіча, А. Аляхновіча і М. Сіраты «Веды» шукала спявачку. Спадарыня Наталля пагадзілася, бо была неабыякавая да беларускай народнай музыкі, жадала паспрабаваць сябе ў якасці спявачкі ў фальклорным гурце, акунуцца ў творчы асяродак канцэртаў, гастроляў і запісаў. У 1990-я гады фальклор Беларусі быў запатрабаваны і на айчыннай сцэне, і за межамі краіны: на хвалі чарговага нацыянальнага адраджэння і «адлігі» гурт шмат выступаў і гастраляваў. «Веды» наведалі з канцэртамі шмат мінскіх пляцовак, мелі гастрольныя вандроўкі ў Польшчы і Германіі.

Сумесная праца прымушала больш глыбока даведвацца адзін пра аднаго, зацікаўленасць творчым патэнцыялам і даляглядам перарасла ў сімпатыю, а павага – ў каханне і сур’ёзныя сумесныя планы на будучыню. Наталля і Уладзімір ведалі, што людзі, чыю музыку яны выконваюць, без шлюбу не ўяўлялі ўдалы і гарманічны лёс для чалавека, і, у прынцыпе, яны былі згодны з такім светапоглядам. Вяселле гулялі ў Мінску, даволі камерна, толькі «для сваіх», але душэўна і весела, па-беларуску.

Шлюб быў дружны і плённы: абодва паспяхова рабілі кар’еру ў галіне выкладання, навуковай дзейнасці, творчасці; абменьваліся думкамі і ідэямі, сумесна шукалі шляхі адаптацыі айчыннага фальклору да сучаснага ўспрымання, вывучэння і захавання; неўзабаве з’явілася новае пакаленне Раговічаў – нарадзіўся вельмі падобны на бацьку Глеб Раговіч. Пра асноўныя дасягненні яго бацькоў, якія пазнаёміліся і злучыліся перадусім на глебе павагі і апантанасці народнай песняй Беларусі, можна пісаць вельмі шмат. Паспрабуем зрабіць гэта сцісла і паслядоўна.

Як апавядаюць інфармацыйныя крыніцы, Наталля Мазурына пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка (1996): «…атрымала ступень магістра педагогікі (1997). З 1997 г. навучалася ў аспірантуры БДПУ. У 2001 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Варыянтнасць існавання і эвалюцыі беларускага песеннага фальклору». Стала дацэнтам літаратуразнаўства (2008). У 2000–2002 гг. працавала ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. Працуе ў БДПУ з 1996 г. …Займалася распрацоўкай і ўдасканаленнем вучэбных праграм па розных дысцыплінах, кіравала музейнай і педагагічнай практыкамі» [4]. Сайт БДПУ імя Максіма Танка характарызуе яе навуковыя інтарэсы як «…этнамузыкалогія і фалькларыстыка (даследаванне сутнасных заканамернасцей існавання беларускага песеннага фальклору, праца з архіўнымі матэрыяламі, сабранымі студэнтамі падчас фальклорна-этнаграфічных практык у розных рэгіёнах Беларусі)» [4], і пералічвае найбольш уплывовыя публікацыі, сярод якіх спецыялістаў па фальклоры і традыцыйнай культуры здольна зацікавіць кожная. Каб уявіць шырыню навуковых інтарэсаў Н. Мазурынай, варта прывесці некаторыя з іх, бо спіс цалкам складаецца з 95 найменняў.

- Мазурына, Н. Варыянтнасць у беларускім песенным фальклоры / Наталля Мазурына // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – Мінск, 1999. – №2. – С. 14–20.
- Мазурына, Н. Дзіцячая песнятворчасць у беларускай народнай культуры: варыянтнасць існавання / Наталля Мазурына // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. – Мінск, 2000. – №2. – С. 23–28.
- Мазурына, Н. Варыянтнасць існавання і эвалюцыі беларускага песеннага фальклору : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.09 / Наталля Мазурына ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2001. – 20 с.
- Мазурына, Н. Тыпалогія вясельных песень Беларускага Палесся / Н. Мазурына, У. Раговіч // Раговіч, У. Песенны фальклор Палесся: у 3-х т. Т. 2. Вяселле. – Мінск : Выд-ва «Чатыры чвэрці», 2002. – С. 5–19.
- Мазурына, Н. Варыянтнасць / Наталля Мазурына // Беларускі фальклор : Энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2005. – Т. 1. – С. 233.
- Мазурына, Н. Напевы беларускіх народных калыханак у сучасных запісах / Наталля Мазурына // Дзіцячы фальклор : зб. фальклор. матэрыялаў/ рэд. кал. У. Васілевіч (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2006. – С. 31–36.
- Мазурына, Н. Мастацтва дырыжора і кампазітара Уладзіміра Раговіча / Наталля Мазурына // Минские Епархиальные Ведомости. – Мінск, 2007. – № 4. – С. 71–73.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Мазурына, Н. Сістэма запісу і транскрыпцыі беларускіх народных песень : вучэб.-метад. дапам. / Наталля Мазурына. – Мінск: БДПУ, 2007. – 33 с.
- Мазурына, Н. Музычна-тэарэтычныя дысцыпліны : праграмна-метад. комплекс / Наталля Мазурына. – Мінск : БДПУ, 2008. – 56 с.
- Лозка, А. Ю. Беларуская фалькларыстыка : Каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія : вучэб.-метад. дапам. / А. Лозка, Н. Мазурына. – Мінск : БДПУ, 2009. – 104 с.
- Фальклор Магілёўшчыны : матэрыялы з раёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС / склад. А. Гурскі, А. Марозаў, Н. Мазурына. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 530 с.
- Мазурына, Н. Варыянтнасць у беларускіх куставых песнях / Наталля Мазурына // Мастацтва і асоба: матэрыялы III міжнар. навук. канф., Мінск, 24 крас. 2013 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка; рэдкал.: Т.С. Багданава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 159–161.
- Мазурына, Н. Перайманне традыцыйных спеваў ва ўмовах сучаснага горада (на прыкладзе дзіцячага фальклорнага гурта «Рада», г. Мінск) / Наталля Мазурына // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: матэрыялы VIII міжнар. навук. канф., Мінск, 25–27 крас. 2014 г. / Бел. дзярж. ун-т культ. і маст.; рэдкал.: В. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 157–158.
- Мазурына, Н. Каб не сціхала «Благаславі, Божэ, песеньку пачаці…» / Наталля Мазурына // Песні пакінутых вёсак / Уступ. сл. Н. Мазурына, Г. Нячаева, Т. Валодзіна ; паслясл. : Ю. Пацюпа ; уклад. Т. Валодзіна, Н. Мазурына (муз. частка) ; пад агул рэд. А. Лакоткі. – Мінск : Беловагрупп, 2016. – С. 6–8.
- Мазурына, Н. Этнакультурная кампанента ў фарміраванні прафесійных навыкаў педагогаў эстэтычнага профілю / Наталля Мазурына // Весці БДПУ. Серыя 1 (Педагогіка, псіхалогія, філалогія). – Мінск : Выд-ва БДПУ, 2017. – №1. – С. 40–44.
- Мазурына, Н. Актуальныя пытанні методыкі запісу песеннага фальклору ў кантэксце тэорыі варыянтнасці / Наталля Мазурына // Весці БДПУ. Серыя 1 (Педаг., псіхал., філал.). – Мінск : Выд-ва БДПУ, 2017. – №3. – С. 20–24.
- Мазурына, Н. Этапы фарміравання варыянтнасці народных песень у беларускай фалькларыстыцы / Наталля Мазурына // Весці акадэміі навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – №4. – С. 75–82.
- Мазурына, Н. Актуальные вопросы кластерного развития системы подготовки специалистов в области эстетического образования / Наталля Мазурына // Непрерывная система образования «Школа – Университет». Инновации и перспективы : сб. статей Междунар. науч.-практич. конф., Минск, 23–24 февр. 2017 г. / Бел. нац. технич. ун-т ; редкол. : Г. А. Вершина [и др.]. – Минск : БНТУ, 2017. – С. 160–162.

Уладзімір Раговіч перад знаёмствам з Наталляй Мазурынай ужо зарэкамендаваў сябе як творчы спадкаемца «легенды» беларускай практычнай фалькларыстыкі Рыгора Шырмы. Варта адзначыць, што: «У двух дырыжораў – сталага і маладога – склаліся незвычайна цёплыя, шчырыя прафесійныя і асабістыя адносіны. Рыгор Раманавіч часта называў Уладзіміра “сынком”» [5]. У 1970 годзе, улічыўшы высокую ацэнку Раговіча Шырмам, «…кіраўніцтва прызначыла Уладзіміра Раговіча мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР імя Рыгора Шырмы, якой ён і кіраваў да 1982 года» [5].

Неабыякавасць да лёсу беларускай песні, «душы народа» па вызначэнні яго настаўніка Рыгора Шырмы, бескампрамісна вяла У. Раговіча пасля працы ў капэле да педагагічнай працы ў вышэйшых і сярэдне-спецыяльных навучальных установах Мінска і Пінска, але напярэдадні і ў перыяд знаёмства з Наталляй Мазурынай ён «…вяртаецца на працу ў Навукова-даследчую лабараторыю беларускага фальклору і дыялекталогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе актыўна працуе. Збіральнік стаў укладальнікам музычных частак шэрага маштабных зборнікаў:

- Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры. Брэсц. вобл. / уклад. В. Захарава. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1973. – 304 с.
- Палескае Вяселле / уклад. і рэд. В. Захаравай. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 303 с.
- Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры. Гомел. вобл. / уклад. В. Захарава і інш.; уклад. муз. часткі У. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.
- Ліцвінка, В. Песні і строі Піншчыны / В. Ліцвінка, М. Раманюк, У. Раговіч. – Мінск, 1994. – 36 с.
- Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыц. жанры. Мінск. вобл. / уклад. В. Ліцвінка; уклад. муз часткі Г. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

Здабыткам шляху ў дзясяткі гадоў і тысячы кіламетраў стала калекцыя, што налічвае больш як тры тысячы беларускіх народных песень» [5].

Неўзабаве Уладзімірам Раговічам былі выдадзены «Вянок беларускіх народных песень» [1] і два тамы трохтомніка «Песенны фальклор Палесся» [2], [3], якія ў сваіх рэцэнзіях надзвычай высока ацанілі знакамітыя дзеячы практычнай фалькларыстыкі Беларусі. Вось што казаў у адной з іх народны артыст Рэспублікі Беларусь Міхась Дрынеўскі, ураджэнец легендарнай спеўнай вёскі Тонеж і носьбіт яе спеўнай традыцыі, неаднаразова апісанай і знятай у фільмах аўдыявізуальнага антраполага Зінаіды Мажэйкі: «У кнігі У. Раговіча ўключаны лепшыя выкрышталізаваныя часам і талентам узоры традыцыйнага палескага фальклору, што дазваляе весці размову аб іх як своеасаблівай анталогіі беларускай народнай песні...» [5].

Фальклорная традыцыя – не проста статычная з’ява. Яна – жывое «палімернае» ўтварэнне, дзе кожнае звяно знітавана з папярэднім (ад якога пераняло форму і змест) і з наступным (якому іх перадае). Засвоенае Уладзімірам Раговічам і Наталляй Мазурынай мастацтва вуснай традыцыі беларусаў (перанятае ад носьбітаў традыцыі), прайшоўшы праз іх, перадалося іх вучням: інтэрпрэтатарам і транслятарам фальклорных узораў. Вучні У. Раговіча: дырыжор і спявак Аляксандр Аўраменка (Мінск); спявак Уладзімір Гаравы (Гродна). Вучні Н. Мазурынай: Наста Някрасава – спявачка і дактарант Варшаўскага ўніверсітэта; аспірантка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Надзея Дараховіч; фалькларысты-практыкі Вольга Аніскевіч (Лельчыцы) і Ганна Бабчанок (Асіповічы); фалькларыст-практык, этнахарэолаг і мастак па касцюмах Марыя Аднадворцава (Мінск); вядомая ў постфальклорных колах маладая таленавітая спявачка Патрыцыя Свіціна.

«Шчасце ў тым, каб сваё сэрца аддаць іншаму», – казаў Рабіндранат Тагор. Саюз Наталлі Мазурынай і Уладзіміра Раговіча быў плённы не толькі для іх абоіх. Як бачым, ад іх «падвоенай» на глебе сумеснай павагі да песень свайго народа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

энергіі нарадзілася шмат карыснага для айчынных мастацтва, навукі, сацыякультурнай практыкі, фальклорнага руху і этнамастацкай адукацыі. І іх «песня адна на дваіх» яшчэ шмат гадоў прагучыць водгукамі ў справах і дасягненнях іх калег, вучняў і выхаванцаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры. Брэсц. вобл. / склад. В. Захарава. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1973. – 304 с.
2. Палескае Вяселле / уклад. і рэд. В. Захаравай. – Мінск : Універсітэцкае, 1984. – 303 с.
3. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры. Гомел. вобл. / уклад. В. Захарава [і інш.] ; уклад. муз. часткі У. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.
4. Ліцвінка, В. Песні і строі Піншчыны / В. Ліцвінка, М. Раманюк, У. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 36 с.
5. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыц. жанры. Мінск. вобл. / уклад. В. Ліцвінка; уклад. муз часткі Г. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 477 с.



***Ала Навіцкая***


**ГОЛАС ДУШЫ І СЭРЦА**


*У артыкуле распавядаецца аб месцы і ролі беларускіх народных песень запісу выбітнага дзеяча культуры, этнамузыказнаўцы Уладзіміра Раговіча ў рэпертуары ансамбля «Зорачка».*



***Ala Novickaya***


**THE VOICE OF THE HEART AND SOUL**


*The article tells about the place and role of Belarusian folk songs recorded by an outstanding cultural figure, ethnomusicologist Uladzimir Rahovich in the repertoire of the ensemble «Zorachka».*


Перад дзеячамі культуры і адукацыі Беларусі як раней, так і зараз стаіць нязменна актуальная задача: праз папулярызацыю дзіцячай творчасці ўнесці уклад у справу духоўнага развіцця і эстэтычнага выхавання школьнікаў і падлеткаў на лепшых узорах музычнай творчасці беларускага народа. Узорны ансамбль песні і танца «Зорачка», створаны ў лютым 1963 года, – першы ў рэспубліцы калектыў, які сваёй мэтай абраў вывучэнне і адраджэнне традыцый беларускай народнай творчасці.





Малюнак 1 – Выступ ансамбля «Зорачка» на канцэрце, прымеркаваным да 55-годдзя калектыва

У 1975 годзе ў рэпертуары ансамбля з'явіліся беларускія народныя песні, танцы, і ў 1980 годзе М. Іванова пераявяла ансамбль на народна-абрадавы фальклор Беларусі. Менавіта ў гэты час пачалося супрацоўніцтва «Зорачкі» з У. Раговічам, які шчыра даваў парады, падарыў нам свае зборнікі. Спадарыня Маргарыта і Уладзімір Іосіфавіч сябравалі, абменьваліся думкамі, запісамі, зборнікамі песень [1]. У 1981 годзе ансамбль пацвердзіў званне «Фальклорнага ансамбля песні і танца» і выпусціў рэпертуарны зборнік для дзяцей «Зайграй, дударочку».

Як чалавек, улюблёны ў беларускую народную песню, Уладзімір Іосіфавіч дапамагаў рэпертуарам усім кіраўнікам народных калектываў. Расшыфраваныя і запісаныя У.Раговічам песні вельмі дакладныя, з мелізмамі, з падпеўкамі, са шматгалоссем. Гэта энцыклапедычная работа!

Ансамблю 55 гадоў, і 35 з іх мы спяваем у тым ліку і гэтыя песні. Шмат зборнікаў народнапесеннага мастацтва Беларусі выдадзена, дзякуючы У. Раговічу. Вывучаючы іх, пераконваешся ў высокім прафесіяналізме ўкладальніка. «Вянок беларускіх народных песень» [2] – кніга вельмі багатая на песенны матэрыял, сістэмная, энцыклапедычная.

Быць 23 гады на чале такога калектыву (з 35-ці, што працую ў ансамблі «Зорачка») – праца адказная і шчырая. У маім уласным архіве шмат запісаў народных песень і найгрышаў са Слуцкага, Старадарожскага і Салігорскага раёнаў. Але з палескай народнай песняй я пазнаёмілася на вяселлі, бо ўсе родзічы па мужу – з Гомельскай вобласці з вёскі Бібікі, што за Мазыром. Калісьці глядзела, як маладыя ад'ехалі, а вяселле працягвалася без іх. Сталыя людзі пераадзеліся – і вяселле пачалося нанова. Смех, жарты, сватаўство. Я тады яшчэ і не думала, што буду вывучаць гэты найцікавейшы матэрыял у інстытуце (1981 г.) у ансамблі «Валачобнікі» Ст. Дробыша: «Ой, зіма, зіма», «Вол бушуе» і інш. А ў 1984 годзе мяне запрасілі ў фальклорны ансамбль песні і танца «Зорачка». Вось тут было вельмі цяжка, таму што з дзецьмі ніхто не вывучаў традыцыйную культуру. Але ўжо была выпушчана кніга Г. Барташэвіч «Дзіцячы фальклор». А палескія народныя песні, якія я пачула, знайшла ў зборніках У. Раговіча (потым былі З. Эвальд, З. Мажэйка, Г. Барташэвіч, В. Ліцвінка).

У 1984 годзе на 4 курсе Інстытута культуры на экзаменах мы спявалі апрацоўкі народных песень В. Рашчынскага («За рэчкай, за ракой», «Туман-туманочак», «Там, дзе ручалачка бяжала») і песні са зборнікаў У. Раговіча («Ой, зіма, зіма ты марозная», «А мы проса сеялі» і інш.).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ